01. 04. 2015 №20 (43)

# Вострaў ЮФ

Газета Юрыдычнага Факультэта БДУ




# З 70-годдзем Вялікай Перамогі!

# 70 год Вялікай Перамогі

**_Паважаныя чытачы, гэты нумар газеты прысвечаны сямідзесяцігоддзю Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі._**

Падзеі Вялікай Айчыннай Вайны назаўжды застануцца ў памяці нашага народа. Не ведае яна сабе роўных. Нельга ўявіць сабе такіх маштабных страт: людскіх, матэрыяльных, маральных. Гэтая вайна закранула чатыры пятых насельніцтва зямнога шара, сорак дзяржаў, некалькі кантынентаў, мораў і акіянаў. Загінула каля шасцідзесяці мільёнаў чалавек. 1418 дзён і начэй - вось кошт доўгачаканай перамогі. Яе значэнне цяжка пераацаніць. Яе водгукі да гэтага часу бударажаць сэрца і розум чалавека.

Звыш 1,3 млн. беларусаў змагаліся ў радах Чырвонай Арміі, 374 тыс. чалавек удзельнічала ў партызанскім руху, 70 тыс. чалавек вялі барацьбу ў падполлі, амаль 400 тыс. жыхароў Беларусі складалі партызанскія рэзервы, некалькі тысяч ураджэнцаў Беларусі змагаліся ў радах еўрапейскага руху Супраціўлення. Насельніцтва Беларусі праявіла мужнасць, самаадданасць, самаахвярнасць у барацьбе за свабоду і незалежнасьць Бацькаўшчыны. Гэта была сапраўды Вялікая вайна.

Няма ў нашай краіне такой сям'і, якую б не закранулі падзеі Вялікай Айчыннай Вайны. Няма такога чалавека, які б не чуў аб тых кровапралітных баях. У Рэспубліцы Беларусь загінуў амаль кожны трэці жыхар, а гэта больш за тры мільёны чалавек.

І мы, людзі сучаснасці, абавязаны захоўваць у памяці і шанаваць падзеі тых гадоў. Мы не маем права забываць тых подзвігаў, якія былі здзейснены ў імя нашай свабоды, у імя нашай мірнай сучаснасці і будучыні, у імя дзяцей, унукаў і праўнукаў. Памяць - гэта самае малое, што мы можам аддаць у знак падзякі тым, хто назаўсёды застаўся на полі бою, хто не шкадуючы сябе стаяў да апошняга.

Рэспубліка Беларусь беражліва захоўвае імёны тых, хто змагаўся і загінуў, хто змагаўся і выжыў, хто стаяў да смерці дзеля жыцця на зямлі, дзеля міру будучыні, дзеля тварэння і стварэння.

***Рэдакцыя газеты "Востраў ЮФ"***

# Дакрануцца да гісторыі

Вялікую ролю адыгралі ў барацьбе супраць фашызму выкладчыкі, студэнты і выпускнікі Мінскага юрыдычнага інстытута. Іх імёны назаўсёды засталіся ў гісторыі. Іх подзвіг несмяротны ніколі не будзе запамятаваны.

Выкладчыкі факультэта вначале з прафесарам І.І.Гарэлікам, дацэнтам кафедры крымінальнага права М. А. Бабіем і студэнцкай групай «Пошук» 5 мая 1986 г. заснавалі музей гісторыі юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Яны па крупінках збіралі матэрыял, архіўныя дакументы, фотаздымкі, якія адносяцца да далёкіх дваццатых - сямідзесятых гадоў.

Сцены музея раскрываюць для нас усю гісторыю факультэта. Стэнд за стэндам апавядае нам аб розных эпохах у жыцці факультэта.

Першы з іх прысвечаны 1921–1931 гг. Тут вы можаце пазнаёміцца з гісторыяй ўзнікнення і пачатку функцыяніравання факультэта.

Другі стэнд адлюстроўвае перыяд станаўлення і дзейнасці Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута (1932–1941гг.). Тут захавалася першае выданне «Ученых записок» інстытута. «Яны змагаліся ў дзеючай арміі. У інстытут не вярнуліся» – надпіс на наступным стэндзе. Ён апавядае пра студэнтаў, якія пайшлі на фронт і аддалі жыццё за Радзіму.

Яшчэ адзін стэнд носіць назву "Агністы выпуск". У роднай зямлі і на чужыне засталіся ляжаць многія студэнты і выкладчыкі. Прозвішчамі некаторых з іх сёння названы вуліцы нашай сталіцы і іншых гарадоў рэспублікі. Наведвальнікі музея заўсёды затрымліваюцца каля стэнда, дзе змешчаны напісаныя родным першыя пісьмы з фронту.

Ёсць у музеі і матэрыялы, прысвечаныя пасляваенным выпускнікам, аднаўленню разбураных вучэбных будынкаў, студэнцкім будаўнічым атрадам, дзейнасці дэканата, дзесяці кафедр факультэта і лабараторый.

Так, кожны першакурснік лічыць сваім абавязкам наведаць музей і пранікнуцца атмасферай, якая пануе ў ім. Тут можна дакрануцца да гісторыі роднага факультэта, убачыць шлях яго развіцця і станаўлення, заўважыць сумныя і радасныя старонкі яго жыцця. Гэта выклікае пачуццё гонару за сваіх папярэднікаў, пачуццё патрыятызму, любові да сваёй альма-матэр.

У цяперашні час загадчыцай музея з'яўляецца кандыдат гістарычных навук, дацэнт Л.П.Максімава. Сустрэчы з мінулым у сцянах музея ладзіць менавіта яна.

***Вікторыя Зайцава***

# Вечар Вялікай Айчыннай Вайны на факультэце




***Студэнцкі актыў юрфака БДУ кожны год арганізуе мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню перамогі ў Вялікай Айчыннай Вайне. У гэтым годзе новаабранаму старасце факультэта Максіму Сеніву было даручана пры падтрымцы кіраўніцтва факультэта і саміх студэнтаў арганізаваць віктарыну “70 год Вялікай перамогі”, а таксама кінапрагляд фільма “Брэсцкая крэпасць”.***

Мерапрыемства праводзілася ў сценах роднага факультэта 26 сакавіка. У большасці тых, хто прыйшоў (а такіх сабралося не менш як за сто чалавек), ужо быў скончаны навучальны дзень. Арганізатары пастараліся стварыць нязмушаную атмасферу, каб студэнтам быў цікавы сам фармат таго, што адбываецца.

“Нягледзячы на тое, што час быў ужо няранні, гасцей сабралася шмат. Удзельнікі актыўна адказвалі на пастаўленыя пытанні. Можна сказаць, утварылася нават нейкая канкурэнцыя”, - каментуе Максім Сеніў. Самыя актыўныя ўдзельнікі, якія бліскалі ведамі пра падзеі, месцы і асобы Вялікай Айчыннай Вайны, былі ўзнагароджаны прызамі факультэта: футболкамі і кружкамі з сімволікай юрфака БДУ, а таксама юрыдычнай літаратурай.




Як прызнаюцца арганізатары, сярод удзельнікаў пераважалі прадстаўнікі 1-2 курсаў. У меншым складзе наведалі віктарыну старэйшыя курсы. Аднак цікавым фактам стала і тое, што на мерапрыемстве прысутнічалі замежныя студэнты. Іх веды гісторыі былі таксама не горшымі.



Завяршаў мерапрыемства кінапаказ. Студэнтам быў прадстаўлены знакаміты фільм “Брэсцкая крэпасць”. Удзельнікі паказу прызнаюцца, што бачылі гэты фільм і раней. Аднак з вялікім задавальненнем паглядзелі яго яшчэ раз. “Такія фільмы можна глядзець і пераглядаць. Яны закранаюць душу, пранікаюць у самае сэрца. Гэта наша гісторыя, гэта нашы дзяды і прадзеды. Мне здаецца, адзінкі маглі ўтрымацца сёння без слёз”, - дзеліцца сваімі ўражаннямі студэнтка Таццяна.

Пакінулі студэнты мерапрыемства ўжо позним вечарам. На гадзінніку было каля дваццаці двух. І напрошвалася заканамернае пытанне: ці не шкада было свайго часу? “Вы ведаеце, ні кроплі. Стомленнасць, вядома, ёсць. Але яна прыемная. Пабольш бы такіх вечароў. І даведаешся нешта новае, і з юрыстамі пагутарыш, і фільм душашчыпальны паглядзіш. Адныя плюсы”, - распавядае удзельнік Андрэй.

Мы ж, у сваю чаргу, выказваем падзяку адміністрацыі факультэта і студэнцкаму актыву за арганізацыю такога роду мерапрыемстваў. Спадзяемся, што з кожным годам у факультэта будзе ўсё больш цікавых ідэй.

Андрэй Емельяновіч

*Да году моладзі*

# Моладзь павінна памятаць

**Увосень 2014 года сярод студэнтаў БДУ праводзіўся конкурс на лепшы маладзёжны праект. Ад юрыдычнага факультэта са сваім праектам выступіў Дзмітрый Крышталь, студэнт пятага курса, старшыня Савета стараст юрыдычнага факультэта. У яго каманду ўвайшлі таксама студэнты чацвёртага курса: Глеб Голубеў, Кацярына Вярэніч і Аляксандр Якуцэня.**

Пра праект студэнты даведаліся з сацыяльных сетак і адразу вырашылі дзейнічаць. Адміністрацыя факультэта падтрымала пачынанні удзельнікаў. Рашэнне адносна тэматыкі праекта аказалася аднагалосным: студэнты вырашылі акцэнтаваць увагу на пытанні перамогі ў Вялікай Айчыннай Вайне. А, улічваючы будучы сямідзесяцігадовы юбілей перамогі, назва праекта нарадзілася неадкладна: “У гонар Вялікай Перамогі”.

“Мы імкнуліся ўвекавечыць памяць перамогі беларускага народа ў Вялікай Айчыннай Вайне. Таксама для нас было важным падтрымаць развіццё нацыянальнай ідэі беларускага народа сярод студэнтаў. Але ўсё гэта трэба было зрабіць так, штобы моладзі было неабыякава існаванне нашага праекта і ўвасабленне яго ў жыццё. Так і нарадзілася ідэя злучыць патрыятычны элемент з элементамі здаровага ладу жыцця і спорту, што зараз вельмі папулярна ў колах моладзі”, - каментуе Дзмітрый.

Такім чынам, перад камандай стаяла складаная задача: стварыць у сваім праекце нешта сучаснае, арганічнае, спартовае, але накіраванае на папулярызацыю сярод моладзі подзвігу беларускага народа і асвятленне падзей Вялікай Айчыннай Вайны.

На пытанне, чаму ж дадзеная тэма стала для вас гэтак значнай, Дзмітрый адказаў: “Для мяне заўсёды мела велізарную вагу выказванне: “ народ, які забывае сваё мінулае, не мае будучыні”. У цяперашні жа час усё менш мы можам пачуць гісторый аб Вялікай Айчыннай Вайне з вуснаў саміх удзельнікаў падзей. Так, усё далей для нас становіцца ўсё тое, што адбылося. Усё часцей мы можам сустракаць ілжывую, фальсіфікаваную інфармацыю. Таму для нас было вельмі важна нагадаць моладзі аб падзеях той страшнай вайны”.

Сам Дзмітрый, з’яўляючыся прыхільнікам спорту, паспрабаваў паднесці сур’ёзны матэрыял для разважанняў у гульнявой, спартыўнай форме. Такі праект, як нельга лепш, культывуе здаровы лад жыцця і заняткі спортам сярод студэнтаў і выкладчыкаў БДУ.



Давайце ж пазнаёмімся з прапанаваным планам праекта. У сваёй працы студэнты прапанавалі разбіць увесь комплекс мерапрыемстваў на некалькі блокаў:

### I

Для пачатку студэнтам юрыдычнага факультэта прапану-



ецца на перыядычнай аснове прагляд кінафільмаў на ваенную тэматыку. Такія паказы будуць суправаджацца рознымі гутаркамі, віктарынамі і г.д.

# II

Далей моладзі прапануецца наведванне традыцыйнага спартыўна-патрыятычнага злёту а базе САК "Брыганціна". "Гэта мерапрыемства ўжо палюбілася студэнтамі факультэта. І не ўключыць яго ў праект мы проста не маглі. Сам фармат злёту вельмі блізкі моладзі. Таму мяняць яго кардынальна мы не палічылі патрэбным", - кажа Дзмітрый.

***"Для мяне заўсёды мела велізарную вагу выказванне: "народ, які забывае сваё мінулае, не мае будучыні".***

# III

У якасці наступнага этапу студэнтам факультэта прапануецца правядзенне турніраў па страйкболе. Адзін з іх ужо быў арганізаваны ў лістападзе 2014 года. У ім прынялі ўдзел не толькі студэнты юрыдычнага, але і ваеннага факультэта. З вялікім задавальненнем у мерапрыемстве ўдзельнічалі і выкладчыкі. Кожны турнір прапануецца праводзіць так, каб ён быў прымеркаваны пэўнай падзеі Вялікай Айчыннай Вайны. А самая маштабная бітва, вядома ж, будзе арганізавана ў траўні.

# IV

Не змог не здзівіць рэдакцыю газеты "Вострaў ЮФ" наступны, завяршальны блок. Студэнцкі актыў факультэта плануе правесці забег па горадзе з удзелам студэнтаў і выкладчыкаў БДУ. Забег будзе праходзіць пад лозунгам «У гонар Вялікай Перамогі».

***Па выніках конкурсу дадзены праект быў адзначаны як адзін з лепшых. 2015 аб'яўлены годам ветэранаў ВАВ ў СНД, а ў Беларусі - годам моладзі. Такім чынам, актуальнасць і важнасць праведзенай работы цяжка пераацаніць. У сваім праекце ўдзельнікі аб'ядналі інтарэсы і гісторыю розных пакаленняў і далучылі моладзь сучаснасці да падзей вялікага мінулага.***

***Улада Пырх***

***Напярэдадні святкавання юбілею Вялікай Перамогі рэдакцыя газеты «Вострaў ЮФ» вырашыла задаць некалькі кароткіх пытанняў старшыне Прафкама юрыдычнага факультэта Ганне Шэўчык.***

***- Ганна, скажыце, калі ласка, якія мерапрыемствы, прысвечаныя сямідзесяцігоддзю Перамогі, плануе прафбюро юрфака?***

- У гэтым годзе мы вырашылі арганізаваць нестандартнае мерапрыемства. У гонар святкавання Вялікай Перамогі будзе арганізавана выстава. У ёй будзе апавядацца пра людзей, чые імёны назаўсёды застануцца ў памяці Радзімы. Гэта нашы выкладчыкі - ветэраны ВАВ.

***- А што ж застанецца па-ранейшаму?***

- Традыцыйна мы плануем правядзенне святочнага канцэрта для нашых ветэранаў. Усе жадаючыя змогуць акунуцца ў атмасферу ваеннага часу: пачуць тыя самыя песні, убачыць тыя самыя танцы, адчуць тую самую паэзію. Ну і, вядома ж, традыцыйныя сустрэчы з ветэранамі. Ім заўсёды рады на юрфаку. Асабліва натхняюць гісторыі іх жыцця. Мы стараемся праводзіць гэтыя сустрэчы так, каб ветэраны маглі пагутарыць як з моладдзю і выкладчыкамі, так і паміж сабой.

***Рэдакцыя газеты "Вострaў ЮФ"***

*Пакаленне пераможцаў*

# Вуснамі тых, хто не здаецца

***Юрыдычны факультэт знакаміты таленавітымі выкладчыкамі. Сярод іх ганаровае месца займаюць нашы прафесары С.Р.Драбязка, А.В.Дулаў, В.Ф.Чыгір, М.Р.Юркевіч, удзельнікі Вялікай Айчыннай Вайны.***

З юнацтва на іх долю выпалі цяжкія выпрабаванні. Яны пранеслі скрозь кровапралітныя баі непахісную вернасць свяшчэннаму абавязку абаронцы роднай Айчыны. Скрозь гады прафесара пранеслі свой багаты жыццёвы вопыт. Яны самааддана працавалі на карысць нашай краіны, ўзгадавалі не адно пакаленне таленавітых юрыстаў, выдалі не адзін дзясятак прац.

### *Сцяпан Рыгоравіч Драбязка*



З самага дзяцінства Сцяпан Рыгоравіч цягнуўся да ведаў. Як ён сам прызнаецца, яго вельмі натхняла чытанне. Школу хлопец скончыў выдатна і быў прызваны ў армію. Яго полк дыслакаваўся недалёка ад мяжы з Румыніяй.

У 1941 малады чалавек паступіў у Серпухаўскую школу авіяцыйных механікаў. Калі выбухнула вайна, курсантаў перавялі на паскораны рэжым навучання. Пасля заканчэння вучобы Сцяпана Рыгоравіча паслалі ў 722-і знішчальны авіяцыйны полк. Там яго чакалі цяжкія выпрабаванні. Інтэнсіўнасць палётаў была такой, што старшына амаль не сыходзіў з аэрадрома.

Перамогу Сцяпан Рыгоравіч святкаваў ужо ў Мінску. У першыя ж дні мірнага часу моладзь будавала бурныя планы на будучыню. Малады чалавек вырашыў не марудзіць і адразу паступіў на завочнае аддзяленне Мінскага юрыдычнага інстытута, а затым перавёўся на стацыянар.

Бліжэй да выпуску таленавітага студэнта запрасілі на працу ў пракуратуру, аднак ён абраў шлях іншы - застацца ў аспірантуры. С.Р.Драбязка паспяхова абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыю ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце. Далейшае жыццё прафесар звязаў з БДУ: загадчык кафедры тэорыі і гісторыі права, аўтар шэрагу кніг і вучэбных дапаможнікаў, настаўнік шматлікіх таленавітых юрыстаў.



### *Андрэй Васільевіч Дулаў*

Доктар юрыдычных навук А.В.Дулаў - карэнны ленінградзец. Нарадзіўся ў сямэі прафесара філасофіі В.М.Дулава. З самых ранніх гадоў Андрэю Васільевічу давялося сустрэцца з жыццёвымі цяжкасцямі. Вучачыся ў школе, ён застаўся без дваіх бацькоў, якія былі рэпрасаваны.

Пасля сямі класаў Андрэй Васільевіч паступіў на завод «Чырвоны світанак». Вестка пра вайну заспела А.В.Дулава пад Выбаргам. Па прыездзе ў Ленінград ён вырашыў падацца ў народнае апалчэнне, куды яго рашуча не жадалі браць з-за непрызыўнога ўзросту. Аднак малады хлопец настаяў на сваім. Зусім хутка А.В.Дулаў трапіў у мінамётную роту, якая была ператворана ў кулямётную.

Вяліся доўгія баі пад Ленінградам. Стойкасць байцоў не зламалі ні масавыя ахвяры, ні голад, ні холад. Аддзяленне А.В.Дулава трымала абарону на адным з участкаў недалёка ад Пулкава. Тады і адбылося тое фатальнае раненне, пасля якога скончылася баявая эпапея маладога байца.

Пачылося мірнае жыццё. Андрэй Васільевіч пасля заканчэння дзесяці класаў вырашыў паступаць у юрыдычны інстытут у Казані. Затым былі і курсы адвакатаў, і пракуратура, і Ленінградскі юрыдычны інстытут, і аспірантура, і зайздроснікі, і выключэнне з партыі. Стромкія павароты лёсу толькі гартавалі і без таго моцнага чалавека.

У канцы 1957 года таленавітага юрыста запрасілі на вакантнае месца дацэнта ў юрыдычны факультэт БДУ. Так, звязаўшы сваё жыццё з навукай, Андрэй Васільевіч стаў пазней першым у Беларусі доктарам юрыдычных навук.



## *Васіль Фёдаравіч Чыгір*

Васіль Фёдаравіч да моманту пачатку вайны ўжо скончыў дзесяцігодку. З першых жа дзён баёў малады чалавек дапамагаў партызанам у іх аперацыях. Пазней ён і сам уліўся ў партызанскі атрад імя Чапаева. Там і правёў Васіль Фёдаравіч большую частку вайны.

У 1944 хлопец быў прызваны у 742-й стралковы полк 164-й дывізіі 1-га Прыбалтыйскага фронту. Адціскаючы фашыстаў да ўзбярэжжа Балтыйскага мора, Васіль Чыгір з групай байцоў патрапілі пад абстрэл. Малады чалавек цудам застаўся жывы. Пасля такога ранення ў бой вяртацца было нельга.

Вярнуўшыся да мірнага жыцця, Васіль Фёдаравіч прыступіў да працы бухгалтара. Але неўзабаве вырашыў паступаць у Мінскі юрыдычны інстытут. Пасля дзярдаўных экзаменаў хлопцу прапанавалі застацца ў аспірантуры. Так Васіль Фёдаравіч стаў доктарам юрыдычных навук, прафесарам, заслужаным юрыстам БССР.



## *Мікалай Рыгоравіч Юркевіч*

Вайна заспела Мікалая Рыгоравіча па заканчэнні шасці класаў. Прафесар узгадвае даваенны час з цеплынёй і трымценнем. Наступныя ж гады пакінулі глыбокі след у яго памяці. Будучы зусім юным, Мікалай Рыгоравіч пачаў свой удзел у партызанскай барацьбе. Спачатку ўсё заключалася ў зборы ў навакольных лясах кінутай зброі. Так малады хлопец стаў начальнікам боепітання ў атрадзе імя Суворава.

Незгладжальныя ўспаміны засталіся ў прафесара і ад «рэйкавай вайны». Зладжаныя дзеянні байцоў выклікалі паніку ў нямецкіх штабах і тылавых установах.

Пасля заканчэння вайны Мікалай Рыгоравіч зноў сеў за парту. Здольны юнак за два гады скончыў школу з залатым медалём, і яго былі гатовыя прыняць любыя ВНУ краіны. Аднак выбар упаў менавіта на Мінскі юрыдычны інстытут.

На дзяржаўных іспытах Мікалая Рыгоравіча запрасілі ў аспірантуру. Так і пачаўся яго шлях у навуковую дзейнасць. За доўгія гады вывучэння юрыспрудэнцыі прафесар не толькі стаў яскравым тэарэтыкам, але і практыкам, што прызнае вялікім плюсам. Гэта дапамагае лягчэй знаходзіць агульную мову са студэнтамі, якія, як вядома, большую цікавасць заўсёды выяўлялі да тых, хто і сам паспрабаваў нялёгкага судзейскага «хлеба».

***Мы, маладое пакаленне, схіляем галаву перад несмяротным подзвігам вялікіх людзей. Мы ўдзячныя ім за веру ў нас, за трапяткое выхаванне і перадачу мудрасці іх жыцця. Мы віншуем вас, дарагія ветэраны, з юбілеем Вялікай Перамогі!***

***Улада Пырх***

**Паважаныя студэнты і выкладчыкі юрыдычнага факультэта БДУ!**

**Калі ў Вас ёсць цікавыя думкі, якімі Вы жадалі б падзяліцца з чытачамі газеты “Востраў ЮФ“, дасылайце свае артыкулы на электронную пошту wladlena160495@gmail.com або тэлефануйце на нумар (8029) 343 08 49 (Улада).**

**Спадзяемся на далейшае супрацоўніцтва.**



# Брыганціна, сустракай!

***Аб духу студэнцтва ходзіць пагалоска. Яна перадаецца ад бацькоў дзецям, ад старэйшага курса малодшым, ад выкладчыкаў студэнтам. Дух студэнцтва не зблытаць ні з чым. Штодзённыя лекцыі, экстрым семінараў, рамантыка сесіі. Аднак гэты спіс не можа быць поўным без даўно ўжо стаўшым традыцыяй спартыўна-патрыятычнага злёту «Брыганціна».***

Пачатак быў пакладзены ў далёкім 2007 годзе. Уладзімір Шэўчык (старшыня прафбюро юрфака 2008-2009 г.г.) і Юры Борсук (старшыня спартыўна-аздараўленчай камісіі прафбюро ў гэты ж час) сталі родапачынальнікамі гэтай традыцыі. І цяпер кожны год у напярэдадні святкавання Вялікай Перамогі студэнты юрфака прымаюць удзел у гэтым мерапрыемстве.



Перадаць, што ж менавіта прыцягвае кожны год студэнтаў факультэта на «Брыганціну», складана. Аднак мы паспрабуем апісаць усё тое, што адбываецца, самым падрабязным чынам.

Адбыццё з Мінска з года ў год адбываецца раніцай. Што б ні адбывалася за акном: снег, дождж, спякота. Нішто не перашкодзіць юрыстам правесці адзін з самых займальных дзён разам. Разам са сваімі таварышамі па факультэце і выкладчыкамі.

Пачынаем свой шлях, па традыцыі, з песень. Яны не змаўкаюць на працягу ўсёй дарогі да «Брыганціны». Па прыбыцці кожная каманда ўладкоўваецца ямчэй і наладжваецца на спаборніцтвы. А яны, як правіла, поўняцца нечаканасцямі. Кожны год арганізатары імкнуцца прыўнесці ў спартыўна-патрыятычны злёт нешта новае: новых ўдзельнікаў, новыя спаборніцтвы, новыя прызы.

Дух спаборніцтв пануе на «Брыганціне» ўвесь дзень. Тут і ў футбол пагуляць можна, і ў валейбол, і прадэманстраваць свае атлетычныя ўменні, і паскакаць на скакалцы. Асаблівую цікавасць заўсёды выклікаюць розныя гульні на кемлівасць і цягавітасць. А што можа з'яднаць каманду мацней, чым перацягванне ліны? Словам, да самага вечара вы не зможаце выштукаваць і секунды вольнага часу.

Аднак і пасля выматвальных спаборніцтваў мы яшчэ не гатовыя пакінуць злёт. Увечары нас чакае ўсё самае цікавае. Гэта і вогнішча, і шашлыкі, і песні пад гітару, і танцы. Ну і, вядома ж, падвядзенне вынікаў і ўручэнне прызоў, якія не могуць не радаваць. Арганізатары ніколі не скупяцца і песцяць пераможцаў коннымі і веласіпеднымі шпацырамі, картынг заездамі і пейтболом, а таксама многім іншым.

Пакідаць злёт нікому зусім не хочацца. Бо дзе яшчэ можна правесці такія выхадныя? Дзе можна адчуць дух студэнцкага братэрства, знайсці новых сяброў, пагуляць з выкладчыкамі ў футбол і набрацца сіл і энергіі на доўгі час?

***Мы дзякуем адміністрацыі факультэта і студэнцкаму актыву за арганізацыю штогадовага спартыўна-патрыятычнага злёту, прысвечанага святкаванню перамогі ў Вялікай Айчыннай Вайне.***

***Андрэй Емельяновіч***



**Студэнцкая газета: Востраў ЮФ**

**Галоўны рэдактар**: Улада Пырх
**Рэдакцыйны савет:** С.А. Балашэнка, С.А. Калінін, А.В. Шыдлоўскі
**Над нумарам працавалі:** Улада Пырх, Андрэй Емельяновіч, Вікторыя Зайцава

**Фотаздымкі прадстаўлены**: Вікторыей Клок, Аляксандрай Брысінай, Артурам Маталянцам, Раманам Клімковым, Рэгінай Ярэц
**Адрас Рэдакцыі:** г.Мінск, вул. Ленінградская, 8
*"Востраў ЮФ" шчыра дзякуе за дапамогу дэкану і адміністрацыі сайта юрыдычнага факультэта БДУ (www.law.bsu.by).*